творческих групп. Музей предоставляет широкие возможности как для общения с музейной информацией, так и для содержательной, интересной и неформальной межличностной коммуникации. Музейная встреча может приобретать характер торжества, вечеринки, что происходит с целью знакомства и общения с выдающимися личностями в сфере культуры на тему, связанную с профилем музея. С целью привлечения к себе студенческой молодежи музеям необходимо отходить от схемы «учитель — ученик», создавать культурную площадку для диалога на равных. Еще одна проблема — это персонификация, индивидуализация этнографических экспозиций, акцент на личность. Посетитель стремится приобрести в музейной экспозиции личностный опыт. Если традиционные этнографические экспозиции рассказывают о народах и регионах, то новаторские пытаются раскрыть личность в культуре, вызвать эмоции и волнения. Показательными являются образовательные программы, проводимые на базе Заславского историко-культурного музея-заповедника. Уникальна роль музея в решении проблемы культурной идентификации молодежи и ее позитивного отношения к нравственным ценностям. Музей может оказывать синтезирующее воздействие на интеллектуальную, эмоциональную и моральную сферу личности, активизируя чувственное восприятие, актуализируя личностный опыт и стимулируя ценностное отношение человека к действительности.

Таким образом, в образовательной деятельности музейной педагогики как когнитивного феномена реализуются принципы интеграции образовательного и музейного контекстов, креативности, диалоговости, целостности, информационной меры и персонализации содержания музейной работы с посетителем.

*С. У. Снапкоўскі*
Мінск, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

## Пытанні экалагічнай культуры ў рамках Сусветнага саміта ААН па ўстойлівым развіцці

27 жніўня — 4 верасня 2002 г. у Ёханэсбургу адбыўся Сусветны саміт па ўстойлівым развіцці. Гэта сустрэча на вышэйшым узроўні была прысвечаная 10-й гадавіне саміта ў Рыа-дэ-Жанейра

і накіраваная на выкананне рашэнняў, прынятых на папярэднім саміце. Важнейшае адрозненне ёханесбургскага саміта ад Саміта Зямлі ў Рыа заключалася ў тым, што на гэтай сустрэчы галоўная ўвага была накіраваная на выкананне рашэнняў, сфармуляваных у Парадку дня для 21 ст., які быў прыняты ў 1992 г [3]. На саміце ў Ёханэсбургу выступілі 100 кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў, а колькасць удзельнікаў склала больш за 22 тыс. чал., сярод якіх 10 тыс. дэлегатаў, 8 тыс. прадстаўнікоў неўрадавых арганізацый, 4 тыс. журналістаў [1].

Вынікі Сустрэчыаказалісябольшканкрэтнымі, чымпапярэдніх канферэнцый па экалагічнай праблематыцы. Падчас Сустрэчы быў распрацаваны не толькі план дзейнасці, але і былі вызначаныя адказныя бакі за дасягненне вынікаў у сферы ўстойлівага развіцця і экалагічнай культуры. Галоўнай падзеяй Сусветнага саміта стала прыняцце Ёханесбургскай Дэкларацыі па ўстойлівым развіцці, згодна з якой зноў пацвярджалася прыхільнасць да ўстойлівага развіцця ўсіх прадстаўнікоў народаў свету, якія сабраліся на сустрэчы. Асаблівая ўвага надавалася выкараненню беднасці, узаемнай дапамозе, аб'яднанасці і развіццю чалавечага патэнцыялу.

У прынятай на саміце Дэкларацыі былі пастаўленыя некаторыя новыя важныя мэты, такія як: скарачэнне ўдвая да 2015 г. колькасці долі насельніцтва, якое не мае доступу да асноўных санітарных паслуг; звядзенне да мінімуму да 2020 г. шкоды, якая прычыняецца выкарыстаннем і вытворчасцю хімічных рэчываў здароўю людзей і навакольнаму асяроддзю; захаванне або аднаўленне вычарпаных рыбных запасаў, не пазней, чым да 2015 года; забеспячэнне істотнага зніжэння да 2010 года цяперашніх тэмпаў страты біялагічнай разнастайнасці [2].

Падчас Сусветнай сустрэчы былі створаныя звыш за 300 добраахвотных партнёрстваў, якія ўвасаблялі ідэю супрацоўніцтва паміж развітымі дзяржавамі і краінамі, што сталі на шлях развіцця. Кожнае з гэтых партнёрстваў павінна было забяспечваць збор дадатковых рэсурсаў для падтрымання намаганняў, што робяцца ў мэтах дасягнення ўстойлівага развіцця. Гэтыя партнёрствы, дзейнасць якіх ажыццяўлялася з улікам прынятых урадамі абавязацельстваў, павінны былі забяспечваць выкананне прынятых рашэнняў. У выніку дыялог паміж зацікаўленымі бакамі, асабліва урадамі, грамадзянскай супольнасцю і прыватным сектарам, узняўся на новы ўзровень. Удзельнікі Сустрэчы

на вышэйшым узроўні ў Ёханэсбургу былі вымушаныя ўступіць у сапраўды інтэрактыўны дыялог адносна патрэбаў з улікам пазіцый іншых бакоў.

Наладжванне партнёрстваў дазваляе пераадолець ранейшыя падыходы, у адпаведнасці з якімі вядучая роля адводзілася донарам, і дае магчымасць прадстаўнікам развітых краін і краінам, якія развіваюцца, сумесна распрацоўваць планы да прыняцця неабходных мер. Стварэнне партнёрстваў не вызваляе ўрад ад выканання сваіх функцый і абавязкаў і што задача партнёрстваў складаецца толькі ў тым, каб падняць ажыццяўленне прынятых рашэнняў на якасна больш высокі ўзровень.

Абавязкі па забеспячэнні больш шырокага доступу да водных рэсурсаў і санітарыі, развіцця энергетыкі, павелічэння вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, належнага выкарыстання таксічных хімічных рэчываў, захавання біялагічнай разнастайнасці і больш рацыянальнага выкарыстання экасістэм прымалі не толькі ўрады, але і няўрадавыя і міжурадавыя арганізацыі і камерцыйныя структуры [1].

На канферэнцыі ўдалося надаць выніковым дакументам больш канкрэтны характар, асабліва ў тым, што тычыцца мэтаў і графікаў. Адной з галоўных задач было абвешчана забеспячэнне таго, каб ўстойлівае развіццё набыло шырокія маштабы, каб тое, што добра зарэкамендавала сябе ў дзясятках месцаў, цяпер ўкаранялася б у сотнях і тысячах пляцовак.

Вынікі Сустрэчы былі пазітыўна ўспрынятыя не ўсімі яе ўдзельнікамі. Некаторыя няўрадавыя арганізацыі выказвалі меркаванне, што ўдзельнікі гэтай сустрэчы зрабілі занадта мала ў частцы ўстанаўлення мэтавых паказчыкаў для забеспячэння больш шырокага прымянення аднаўляльных крыніц энергіі. Прэзідэнт Інстытута сусветных рэсурсаў Джонатан Лэш заявіў: «Мы ўпусцілі магчымасць павялічыць вытворчасць энергіі за кошт выкарыстання такіх крыніц, як сонечная энергія, энергія біямасы і энергія ветру, і забяспечыць стабільныя ўмовы для дзейнасці шматлікім кампаніям, якія прымаюць меры па скарачэнні выкідаў» [1].

Варта адзначыць, што Сустрэча на вышэйшым узроўні ў Ёханэсбургу заклала падмурак і падрыхтавала глебу для новых дзеянняў. Саміт не прапанаваў якіх-небудзь цудадзейных рэцэптаў, але змог канстатаваць, што для вырашэння самых надзённых праблем чалавецтва трэба прымаць неабходныя практыч-

ныя меры. Сустрэча ў Ёханесбургу і яе рашэнні сталі важным укладам у фарміраванне новага паняцця і новай тэмы ў міжнародных адносінах — «міжнароднай экалагічнай культуры». Гэтая праблематыка адлюстроўвае ўсё большую ўвагу сусветнай грамадскасці да экалагічных праблем, паколькі навакольнае асяроддзе ў цяперашні час ужо не можа быць аддзелена ад умоў існавання чалавека і з'яўляецца найважнейшым элементам устойлівага развіцця грамадства.

**Літаратура**


1. Йоханнесбургская встреча на высшем уровне 2002 года. 26 августа — 4 сентября 2002 года, Йоханнесбург [Электронный ресурс]. — Режим доступа : http://www.un.org/ru/events/pastevents/wssd.shtml.
2. Йоханнесбургская декларация по устойчивому развитию. Принята на Всемирной встрече на высшем уровне по устойчивому развитию (Йоханнесбург, Южная Африка, 26 августа — 4 сентября 2002 года) [Электронный ресурс]. — Режим доступа : http://www.un.org/ru/documents/decl_conv/declarations/decl_wssd.shtml.
3. Johnson, S. UNEP: the first 40 years. A narrative / S. Johnson.— N.Y. : United National Environmental Program, 2012.



*К. Л. Соколова*
Гомель, Гомельский государственный университет
имени Ф. Скорины


## Организационные условия повышения эффективности межкультурного взаимодействия

Каждая организация, будь это учреждение образования, здравоохранения или коммерческая компания, имеет собственную культуру, состоящую прежде всего из принятых норм, практик, ценностей, программ и процессов, существующих как на сознательном, так и на бессознательном уровнях. Организационная культура, в свою очередь, в значительной степени отражает культуру общества в целом.

Исследователи и практики утверждают, что для того, чтобы системы, организации и практикующие специалисты могли обеспечивать культурно-компетентные услуги, они должны учитывать ценности, убеждения и практики клиентов и адаптировать